# ЗАЎТРА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ




ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 6 (636) | Субота, 22 лютага 1986 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.




## ПАДПІСАЛІ РАПАРТ З'ЕЗДУ

**На пасяджэнні камітэта камсамола падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва студэнтаў універсітэта за права падпісаць рапарт Ленінскага камсамола XXVII з'езду КПСС. Яно вялося з пачатку навучальнага года. Кожны месяц на факультэтах вызначаліся пераможцы прамежкавых этапаў. І вось сталі вядомы імёны самых дастойных, хто пазаўчора ва ўрачыстай абстаноўцы ў Палацы культуры мясцовай прамысловасці падпісаў рапарт.**

...Генадзь Маторны набывае спецыяльнасць эканаміста па працы. Пасля першага года вучобы ён быў прызваны на службу ў рады Савецкай Арміі. Юнак выдатна выконваў свой пачэсны грамадзянскі абавязак, вызначаўся ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Як аднаго з лепшых воінаў яго прынялі кандыдатам у члены КПСС.

Зволіўшыся ў запас, Генадзь працягвае вучобу па абранай спецыяльнасці. Ён з'яўляецца старастай гр. Т-23, членам штаба працоўных спраў факультэта. Грамадскія даручэнні выконвае бездакорна, заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу таварышам. І яны прыслухоўваюцца да кожнай яго парады, да кожнага яго слова. І заканамерна: Генадзь валодае багатымі ведамі. Гэта пацвердзілася і на зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі: усе экзамены ён здаў на «выдатна».

Рапарт форуму камуністаў Краіны Саветаў выпаў гонар падпісаць таксама другакурснікам Іне Цуканавай з матфака, Алене Пасько з фізічнага і Сяргею Лысенку з гісторыка-філалагічнага факультэтаў, трэцякурсніцы біяфака Наталлі Бабковай, студэнту 4-га курса геалагічнага факультэта Генадзю Осіпаву. Усе яны таксама выдатнікі вучобы, актывісты ў грамадскім жыцці, карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам сярод таварышаў па вучобе і выкладчыкаў.

(Наш кар.).

## НА ВАРЦЕ МІРУ І ПРАЦЫ

Заўтра савецкі народ і яго воіны, нашы сябры за мяжой урачыста адзначаць 68-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Па добрай традыцыі дзень нараджэння Узброеных Сіл СССР адзначаецца ў нашай краіне як усенароднае свята. Створаныя для абароны заваёў Вялікага Кастрычніка, Савецкая Армія і Ваенна-Марскі Флот з гонарам выконваюць свой свяшчэнны абавязак. Савецкія воіны накіроўваюць усе свае намаганні і энергію на далейшае павышэнне пільнасці і баявой гатоўнасці ва ўмовах рэзкага абвастрэння ваенна-палітычнай абстаноўкі ў свеце па віне ЗША і іх саюзнікаў па НАТО.

68-я гадавіна Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту адзначаецца ў знамянальны час — напярэдадні адкрыцця XXVII зъезда КПСС. Усё гэта надае асаблівую афарбоўку справам і думкам працаўнікоў гарадоў і вёсак, воінаў арміі і флоту. Савецкія людзі паспяхова завяршылі XI і ўступілі ў першы год XII пяцігодкі. Чарговы XXVII зъезд КПСС вызначыць далейшыя рубяжы сацыялістычнага і эканамічнага развіцця нашага грамадства, умацавання абароннай магутнасці краіны.

Час падрыхтоўкі да партыйнага форуму стаў яшчэ адной яркай старонкай у жыцці гераічных Савецкіх Узброеных Сіл, адлюстраваўшы аднадушную падтрымку воінамі арміі і флоту палітыкі партыі, яе стратэгічнай лініі на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, іх цесную згуртаванасць вакол КПСС.

Нязгаснай славай пакрылі сябе нашы Узброеныя Сілы ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны, 40-годдзе Перамогі ў якой урачыста адзначыць не толькі савецкі народ, але і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва.

Сёння ў радах нашых Узброеных Сіл знаходзяцца ўжо сыны і ўнукі тых, хто насмерць стаяў пры абароне Масквы і Ленінграда, чый баявы шлях пралёг ад Сталінграда да Берліна. Сваю вернасць гераічным традыцыям старэйшых пакаленняў цяперашнія абаронцы краіны дэманструюць самаадданай ратнай працай, памайстэрску кіруючы складанымі баявымі машынамі, ракетнымі комплексамі і радыёэлектроннымі сістэмамі, атамнымі падводнымі лодкамі і звышгукавымі паветранымі караблямі.

У нашым універсітэце вучыцца нямала былых воінаў, якія бездакорнай службай Радзіме заслужылі шматлікія заахвочванні і ўрадавыя ўзнагароды. Сярод іх — Міхаіл Жукевіч, Яўген Белаш, Аляксандр Закаўраш, Алег Коваль, Аляксандр Осіпаў, Аляксандр Лунёў, Анатоль Байкоў і інш.

Рашэнне задачы абароны нашай Айчыны патрабуе ўдзелу ў гэтай справе грамадскіх патрыятычных арганізацый і, перш за ўсё, ДТСААФ. У сваіх радах яно аб'ядноўвае цяпер больш 107 мільёнаў чалавек. Абароннае таварыства ставіць сваёй асноўнай мэтай дапаўняць ваенныя функцыі дзяржаўных органаў грамадскімі формамі далучэння працоўных і моладзі да ўмацавання абароназдольнасці краіны, выхавання іх пастаяннай гатоўнасці да абароны Радзімы.

Арганізацыя ДТСААФ нашага універсітэта сумесна з камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі, спартклубам ГДУ пры актыўным удзеле ветэранаў вайны і працы праводзяць вялікую работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі і правядзенню разнастайных абаронна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў. Гэта садзейнічае падрыхтоўцы актыўных абаронцаў Радзімы — прадаўжальнікаў лепшых традыцый старэйшых пакаленняў.

Па выніках 1985 года пярвічная арганізацыя ДТСААФ ГДУ прызнана пераможцай раённага і абласнога аглядаў-конкурсаў абаронна-масавай работы ў гонар 40-годдзя Перамогі і ўзнагароджана граматамі.

У пастаноўцы абаронна-масавай, ваенна-патрыятычнай і спартыўнай работы за 1985 год, а таксама па выніках Усесаюзнага месячніка абаронна-масавай работы лепшых паказчыкаў дасягнулі матэматычны, гісторыка-філалагічны, эканамічны факультэты і факультэт фізвыхавання. У гэтым вялікая заслуга партыйных, камсамольскіх прафсаюзных арганізацый названых факультэтаў. Камітэт ДТСААФ, камітэт камсамола і прафкомы выказваюць вялікую ўдзячнасць ветэранам вайны У. Д. Арэшчанку, А. А. Баскакаву, Б. В. Бокуцю, М. А. Дзмітрыеву, Г. С. Еўдакіменку, А. С. Калугіну, А. А. Косцікаву, У. П. Ксянзову, М. М. Маёраву, Р. С. Мільчанку, М. В. Навучыцелю, П. А. Савінскаму, Я. А. Семенчуку, У. С. Сідараву, А. І. Рыбіну, А. І. Украінцу, І. Ф. Харламаву, В. А. Хількевічу, У. А. Шаўчэнку, М. П. Шкарбуну і іншым таварышам, якія ўносяць вялікі ўклад у справу ваенна-патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання студэнцкай моладзі.

Далейшае павышэнне эфектыўнасці і якасці ваенна-патрыятычнай, абаронна-масавай і спартыўнай работы будзе нашым лепшым укладам у ажыццяўленне рашэнняў, якія прыме XXVII з'езд КПСС.

**КОЎШ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ ГДУ, маёр у адстаўцы.**

## НА КАМУНІСТЫЧНЫМ СУБОТНІКУ



**Дружна працавалі на камуністычным суботніку, прысвечаным XXVII з'езду КПСС, студэнты ГДУ. Новыя будынкі гарадскога універмага і гасцініцы «Турыст», паліклініка № 8 сталі 15-га лютага аб'ектамі іх плённай працы.**

**Гэтых дзяўчат, студэнтак універсітэта, наш фотакарэспандэнт Н. Кір'янава сфатаграфавала ў час разбіўкі клумб у холе гасцініцы «Турыст».**

*Лічбамі — аб зімовай сесіі*

## ЗРУХІ І ЗБОІ

Набірае тэмп другі семестр навучальнага года. Вынікі ж першага леглі ў справаздачы. Па іх ужо можна меркаваць аб узроўні і якасці паспяховасці студэнтаў усіх факультэтаў універсітэта. Лепшы паказчык па абсалютнай паспяховасці мае гісторыка-філалагічны факультэт — 94,6% (у мінулым годзе 92,9%). На наступных месцах размясціліся адпаведна: біяфак — 93,6 (94,8), фізічны факультэт — 90,5 (88,7), факультэт фізвыхавання — 88,9 (88,0), эканомфак — 86,3 (91,3), матфак — 86, (85,7), геафак — 84,8 (88,1).

Як бачна, узровень паспяховасці ў параўнанні з зімовай сесіяй мінулага года ўзрос на чатырох факультэтах: гістфіле, фізічным, матэматычным факультэтах і факультэце фізвыхавання. Разам з тым трэба адзначыць, што на гісторыка-філалагічным факультэце на 3,4% знізілася паспяховасць будучых гісторыкаў.

Сёлета горшыя якасныя паказчыкі паспяховасці на біялагічным, эканамічным і геалагічным факультэтах. Асаблівую трывогу выклікаюць паказчыкі апошніх двух факультэтаў, дзе паспяховасць знізілася адпаведна на 5 і 3,3%.

Зменшылася ў гэтым годзе і колькасць выдатнікаў. Летась пасля зімовай сесіі іх было 277, цяпер — 260. А вось студэнтаў, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі, павялічылася з 156 да 186. І гэта ў той час, калі агульная колькасць здаваўшых сёлета зімовую сесію зменшылася на 133 чалавекі.

Паспяховасць студэнтаў (а яна ў цэлым па універсітэту па выніках зімовай сесіі ў параўнанні з леташнім знізілася на 0,2%), адлюстроўвае не толькі нашы дасягненні, але і недапрацоўкі, пралікі. Гэта павінна стаць прадметам сур'ёзнай, дзелавой размовы на кожным факультэце, кожнай кафедры. Ажыццяўляючы рашэнні партыі і ўрада па вышэйшай школе, трэба не на словах, а на справе прымяніць усе рычагі для якаснага паляпшэння падрыхтоўкі маладых спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй.

І яшчэ: трэба дамагацца, каб студэнты своечасова ліквідавалі ўсе «правалы». Нельга дапускаць таго, калі экзамены не пераздаюцца на станоўчую адзнаку доўгі час.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

*З ВОПЫТУ ПРАПАГАНДЫСЦКАЙ РАБОТЫ*

# ЭКАНАМІЧНЫЯ СТЫМУЛЫ Ў БУДАЎНІЦТВЕ

**У адпаведнасці з планамі работы Савета па эканамічнай адукацыі пры Цэнтральным РК КПБ і метадсавета кабінета палітасветы будтрэста № 14 на мінулым тыдні на базе школы канкрэтнай эканомікі «Ад эксперыментаў — да новай сістэмы гаспадарання» БУ-46 адбыўся семінар прапагандыстаў па тэме «Новы эксперымент беларускіх будаўнікоў — як элемент удасканальвання гаспадарчага механізму». Заняткі былі адкрытымі. На іх запрасілі ўсіх прапагандыстаў, якія вядуць гэты курс на іншых прадпрыемствах і ў арганізацыях раёна. Прысутнічалі таксама загадчыкі кабінетаў палітасветы на грамадскіх пачатках.**

**Заняткі вёў прапагандыст Віктар Рыгоравіч Кароўкін.**

ВА УСТУПНЫМ слове В. Р. Кароўкін адзначыў актуальнасць вызначанай тэмы ў святле задач па паляпшэнню структуры капітальных укладанняў, скарачэнню тэрмінаў, павышэнню якасці будаўніцтва. З улікам тых патрабаванняў, якія ставяцца сёння, існуючы парадак арганізацыі будаўніцтва патрабуе карэннага ўдасканальвання. Патрэбна сістэма паказчыкаў планавання і разлікаў. Вывучэнне і распаўсюджанне вопыту эксперыменту беларускіх будаўнікоў стымулюючага скарачэння матэрыяльных, працоўных і фінансавых затрат набывае асаблівае значэнне. У будучым годзе ставіцца задача пераводу на новую сістэму разлікаў у праектаванні і будаўніцтве ўсіх аб'ектаў рэспублікі, у аснову якой ляжа стабільная (дагаворная) цана на будаўнічую прадукцыю.

У XII пяцігодцы патрэбна скараціць не менш чым на 4—5% удзельныя паказчыкі каштарыснага кошту будаўніцтва.

Аб значнасці ўсёй гэтай работы, але ўжо ў плане абмеркавання перадз'ездаўскіх дакументаў, гаварыў слухач школы Г. Марголін. Кардынальнае паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу выступае галоўным рычагом павышэння эфектыўнасці вытворчасці. У мэтах інтэнсіфікацыі эканомікі неабходна істотна ўзняць тэхніка-эканамічны ўзровень будаўніцтва, пераўтварыць будаўнічую вытворчасць у адзіны індустрыяльны працэс.

Цікава прайшоў у слухачоў разгляд пытанняў, прапанаваных прапагандыстам.

Аб невыкарыстоўваемых рэзервах павышэння эфектыўнасці будаўніцтва гаварыла Г. Макарэвіч. Яна адзначыла, што на многіх аб'ектах застаецца высокай удзельная вага паказчыкаў расходу матэрыялаў і працоўных затрат. У распрацоўваемых праектах не заўсёды ўлічваліся навейшыя дасягненні навукі і тэхнікі. У такім жа становішчы і будаўнікі. У каштарысным кошце будаўніцтва 60% складаюць расходы на матэрыялы і больш 20% — на аплату працы. Скарачэнне гэтых затрат прыводзіць да зніжэння аб'ёму таварна-будаўнічай прадукцыі і пагаршэння іншых паказчыкаў работы падрадных арганізацый. Таму неабходна ўвязваць эканамічныя інтарэсы і ўзаемную адказнасць усіх удзельнікаў капітальнага будаўніцтва, уключаючы заказчыкаў, праектыроўшчыкаў і будаўнікоў, г. зн. увесці стымуляванне за зніжэнне каштарыснага кошту.

Па пытанню сутнасці і асноўных палажэнняў эксперыменту беларускіх будаўнікоў выступіў А. Кавалёў.

— Асновай эксперыменту, — сказаў ён, — з'яўляецца прымяненне стабільных каштарысных цэн на будаўнічую прадукцыю, выкарыстоўваемых у разліках паміж заказчыкамі і падрадчыкамі, а таксама пры планаванні і ацэнцы вытворчай дзейнасці будаўніча-мантажных і праектна-пошукавых арганізацый. Рознасць паміж гэтым коштам і коштам вытворчасці будаўніча-мантажных работ, удакладненая на стадыі рабочага праектавання з улікам эканамічных праектных рашэнняў, размяркоўваецца паміж дзяржаўным бюджэтам, праектна-пошукавымі і будаўніча-мантажнымі арганізацыямі, а таксама арганізацыямі-заказчыкамі і становіцца ў іх дадатковай крыніцай матэрыяльнага заахвочвання работнікаў. Гэты падыход базіруецца на вопыце ГДР, дзе прымяненне стабільных цэн на будаўнічую прадукцыю дазволіла паскорыць рэалізацыю навукова-тэхнічных дасягненняў і забяспечыць на гэтай аснове істотную эканомію вытворчых рэсурсаў. Для ажыццяўлення эксперыменту распрацаваны метадычныя палажэнні, якія зацверджаны міжведамаснай камісіяй пры Дзяржплане СССР па пытаннях прымянення новых метадаў планавання і эканамічнага стымулявання.

З растлумачэннем парадку ўдзелу ў эксперыменце выступіў В. Пучкоў:

— Па ўмовах эксперыменту ўдзельнічаць у ім, — гаварыў слухач школы, — могуць праектна-пошукавыя, будаўніча-мантажныя арганізацыі і заказчыкі. Можна падключаць таксама прадпрыемствы прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і будіндустрыі. Асноўныя функцыі, звязаныя з правядзеннем эксперыменту, ускладаюцца на праектна-пошукавыя арганізацыі, а дагаворная работа— на апарат будаўніча-мантажнай арганізацыі. Прапановы аб уключэнні аб'екта ў эксперымент уключаюцца толькі пасля ўзгаднення іх з праектна-пошукавай, падраднай арганізацыямі і заказчыкам. Дзяржбуду рэспублікі дасылаецца пратакол узгаднення.

Упраўленне праектных арганізацый Дзяржбуда БССР правярае сапраўднасць прадстаўленай інфармацыі і ў снежні (папярэдняга года планаваму) складае праект пераліку аб'ектаў, уключаемых у эксперымент. Удакладненне зацверджанага пераліку ўключаных у эксперымент аб'ектаў прадугледжваецца два разы ў год: 1 сакавіка і 1 жніўня. Карэктыроўка праводзіцца на аснове прапаноў праектна-пошукавых арганізацый з адпаведнымі абгрунтаваннямі.

Аб размеркаванні і выкарыстанні сродкаў, якія ўтвараюцца за кошт эканоміі ад прымянення ў праектах навукова-тэхнічных дасягненняў, расказала Э. Чарнова:

— Чвэрць эканоміі, — зазначыла яна, — застаецца ў распараджэнні падрадных арганізацый для пакрыцця затрат на ўкараненне навукова-тэхнічных дасягненняў. Такая ж доля эканоміі ад прымянення ў праекце навукова-тэхнічных дасягненняў уносіцца будаўнікамі ў дзяржаўны бюджэт. Астатняя сума — 50% — накіроўваецца ў фонд матэрыяльнага заахвочвання ўдзельнікаў эксперыменту. Гэтыя сродкі расходуюцца для прэміравання работнікаў з улікам дасягнутай эфектыўнасці правядзення эксперыменту, а таксама на паляпшэнне сацыяльна-бытавых умоў працоўных калектываў.

Аб прэміраванні ўдзельнікаў эксперыменту на занятках гаварыла Л. Цяленчанка.

З цікавасцю былі заслуханы на занятках вынікі двух дамашніх заданняў: «З вопыту правядзення эксперыменту ў будтрэсце № 14» і «За кошт чаго была атрымана эканомія на аб'ектах, уключаных у эксперымент», з якімі выступілі А. Саковіч і С. Барысевіч. Каштоўнасць падобнай формы, прыменены прапагандыстам, заключаецца ў тым, што яна істотна дапаўняе тэарэтычныя палажэнні фактычным матэрыялам і дазваляе слухачам па-сапраўднаму зразумець дзейснасць эксперыменту. Так, у мінулым годзе ў эксперыменце ўдзельнічала пяць упраўленняў трэста. Эканомія ад укаранення новых праектных распрацовак склала каля 200 тысяч рублёў. Прыкладна больш чым на 2 тысячы чалавека-дзён зменшыліся працоўныя затраты. На 0,8% правялічылася прадукцыйнасць працы, прыбытак склаў 27,3 тыс. рублёў.

Падагульняючы заняткі, прапагандыст В. Р. Кароўкін даў ацэнку выступленням, а таксама заданне па вывучэнню наступнай тэмы.

У абмеркаванні адкрытых заняткаў прынялі ўдзел прапагандысты Е. Гінзбург, А. Шалабасаў (будтрэст № 14), А. Кураш («Гомельводбуд»), В Сахненка (завод вымяральных прыбораў), Г. Каменшчыкаў (упраўленне мясцовай прамысловасці), М. Пяскоўская (ДБК), М. Савасцьянаў (загадчык кабінета палітасветы на грамадскіх пачатках будтрэста № 14), В. Мацюк (сакратар парткома будтрэста № 14), Г. Ветлугаеў (ГДУ), загадчык кабінета палітасветы Цэнтральнага РК КПБ В. Бабовіч і інш.

Выступіўшыя адзначылі высокі ўзровень метадычнай і тэарэтычнай падрыхтоўкі да заняткаў як прапагандыста, так і слухачоў. Звернута ўвага на праблемнасць выкладання матэрыялу, на выяўленне вузкіх месц у арганізацыі эксперыменту, творчы падыход слухачоў да справы, на разнастайнасць форм падачы матэрыялу. Не абышлося, натуральна, і без крытычных заўваг. У рамках адных заняткаў вельмі складана і цяжка раўназначна разгледзець усе пастаўленыя пытанні. Скарачэнне іх дало б больш часу для дыскусійных спрэчак, некаторых удакладненняў. Але ўсе выступіўшыя былі аднадушныя ў карыснасці падобных заняткаў і неабходнасці іх працягу.

Вопыт падрыхтоўкі і правядзення прайшоўшых заняткаў засведчыў, што поспех можа быць дасягнуты толькі тады, калі да гэтай складанай і працаёмкай работы актыўна падключаецца партыйная арганізацыя, адміністрацыя, метадычны Савет і Савет па эканамічнай адукацыі пры Цэнтральным РК КПБ.

**Аглядны матэрыял падрыхтавалі: дацэнт кафедры палітэканоміі, член Савета па эканамічнай адукацыі пры Цэнтральным РК КПБ Г. ВЕТЛУГАЕЎ і асістэнт кафедры галіновых эканомік Г. БОРСУК.**

*ЗОРНЫ ПАХОД*

# ПРАГРАМА БЫЛА НАСЫЧАНАЙ

**Штогод у лютым студэнты нашага універсітэта адпраўляюцца ў Зорныя паходы па раёнах Гомельшчыны. Сёлетні паход прысвячаўся XXVII з'езду КПСС, 68-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту і Міжнароднаму году міру.**

**Студэнты наведалі вёску Бабовічы, Курыцічы, Ляскавічы, Чалюшчавічы, Галубіцы Петрыкаўскага раёна. Перад працаўнікамі сельскай гаспадаркі з лекцыямі аб дасягненнях Гомельшчыны ў гонар XXVII з'езда КПСС выступаў кіраўнік пахода П. П. Саковіч. Яго выступленні закранаді і такую важную праблему як барацьба з п'янствам і алкагалізмам.**

ПАЎСЮДНА гледачы цёпла сустракалі выступленні самадзейных артыстаў ГДУ.

Кожны канцэрт вядучыя праграмы студэнтка 1-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта Святлана Прэжына і другакурснік фізічнага факультэта Андрэй Самсонаў пачыналі з узнёслых слоў звароту да вяскоўцаў.

Вялікую адказнасць адчувалі за сабой удзельнікі агітбрыгады, гаворачы мовай песень, танцаў, вершаваных радкоў аб плённай працы, савецкім ладзе жыцця, аб поспехах савецкіх людзей. Адначасова высмейваліся ўсе існуючыя яшчэ заганы. У гэтым сэнсе вельмі актуальнай была літаратурна-музычная кампазіцыя «Аб'явім п'янству бой!». Барацьба з п'янствам — гэта барацьба за жыццё, светлае, працоўнае. Як доказ гэтага, у выкананні студэнткі 2-га курса матэматычнага факультэта Ларысы Міхаленка прагучаў урывак з паэмы Р. Раждзественскага «Пісьмо ў XXX век».

Трэба адзначыць цэласнасць усёй праграмы. Гледачы апладыравалі песням аб роднай зямлі, прыродзе нашага краю, якія выконвалі Таццяна Парэмская, Валерый Ігнатаў і Мікалай Васюк. Прыхільна сустрэлі сельскія жыхары цыкл беларускіх песень у выкананні вакальнай групы фальклорнага ансамбля універсітэта. Беларуская полька «Янка», якую выконваў на гітары пяцікурснік фізічнага факультэта Юрый Капоця, змянялася жартоўным танцам «Па дарозе з кірмашу» і ўкраінскім народным. З ім выступалі салісты ансамбля народнага танца «Калінка» Вольга Кавалёва, Валянціна Шчагалькова і Мікалай Васюк.

На змену танцам прыходзілі новыя песні. Як заклік да захавання міру на планеце, знішчэння войн прагучала песня «Вайна і дзяцінства» на вершы чацвёртакурсніцы гісторыка-філалагічнага факультэта Таццяны Пяцелінай, музыку да якой напісала аўтар гэтых радкоў. Яна ж і выконвала гэту песню на канцэртах. Словы яе «...И чтобы никто, никогда на земле и в играх не думал бы о войне» некалькі раз гучалі са сцэны пад апладысменты гледачоў.

Шмат цікавых нумароў паказалі ўдзельнікі агітбрыгады: эстрадныя танцы ў выкананні студэнтак 3-га курса факультэта фізічнага выхавання Таццяны Рыбаковай і матфака Алы Капусцінай, лірычныя песні студэнтак фізічнага факультэта Ірыны Кузьміной і Таццяны Парэмскай, выступленне ўдзельнікаў студэнцкага тэатра эстрадных мініяцюр.

На працягу двухгадзіннай канцэртнай праграмы зала з захапленнем сачыла за кожным выступленнем, і бурныя яе апладысменты сталі добрай ацэнкай усёй работы агітбрыгады.

Кожны канцэрт агітацыйна-мастацкай брыгады заканчваўся песняй С. Наміна «Мы жадаем шчасця вам», і ўсе 23 яе ўдзельнікі нібы гаварылі: «Да новых сустрэч!». А па тварах гледачоў, якія сядзелі ў зале, было зразумела, што жаданне гэта — ўзаемнае.



**НА ЗДЫМКУ: фінал канцэртнай праграмы агітбрыгады. Пад акампанемент Ю. Капоця (на пярэднім плане) выконваецца песня «Мы жадаем шчасця вам».**

**М. ШЫРЫНКІНА,**
**мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба ГДУ «Маладосць».**
**Фота аўтара.**

# ВЫНІКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ФАКУЛЬТЭТАЎ І КАФЕДР ЗА 1985 ГОД

Змешчаныя на гэтай старонцы табліцы аб выніках сацыялістычнага спаборніцтва факультэтаў і кафедр за 1985 год наглядна дэманструюць, як папрацаваў кожны калектыў на фінішы мінулай пяцігодкі. Асноўныя паказчыкі пракаменціраваны ў папярэднім нумары шматтыражкі. Сёння неабходна сказаць аб тым, што пара актывізаваць усе формы работы калектывам кафедр гісторыі КПСС, гісторыі СССР і БССР, якія ўжо не першы год займаюць апошнія месцы ў спаборніцтве кафедр грамадскіх навук.

Сярод кафедр гуманітарнага профілю вырашана прысудзіць другое і трэцяе месцы кафедрам беларускай літаратуры і беларускай мовы. Першай з іх хочацца пажадаць больш удумлівых адносін да распрацоўкі сацыялістычных абавязацельстваў, больш разнапланавай работы.

Нельга не адзначыць і тое, што ў параўнанні з 1984 годам пагоршылі свае пазіцыі кафедры англійскай мовы, нямецкай і французскай моў, усеагульнай гісторыі. Агульны поспех універсітэта складаецца з укладу ў яго ўсіх падраздзяленняў. Трэба дамагацца, каб ён быў як мага большым.

**Г. ГАДЛЕЎСКАЯ,**
**старшыня вытворча-масавай камісіі прафкома.**

### ФАКУЛЬТЭТЫ

| Факультэты | I раздзел Ачкі | I раздзел Балы | II раздзел Ачкі | II раздзел Балы | III раздзел Ачкі | III раздзел Балы | IV раздзел Ачкі | IV раздзел Балы | Сума балаў | Месца |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Фізічны | 269,1 | 57,6 | 849,8 | 43,4 | 83,2 | 27,2 | 389,9 | 55,8 | 184,0 | IV |
| Матэматычны | 182,5 | 39,0 | 1853,1 | 94,7 | 153,4 | 49,9 | 325,0 | 46,5 | 230,1 | I |
| Эканамічны | 264,7 | 56,7 | 908,9 | 46,4 | 77,8 | 25,3 | 283,4 | 40,5 | 163,9 | IV |
| Гісторыка-філалагічны | 131,9 | 28,2 | 559,1 | 28,0 | 71,8 | 23,3 | 98,3 | 14,1 | 94,2 | VI—VII |
| Фізвыхавання | 186,2 | 39,8 | 608,7 | 31,1 | 98,9 | 32,1 | 32,8 | 4,7 | 107,7 | V |
| Біялагічны | 187,1 | 40,1 | 609,5 | 31,1 | 85,5 | 27,9 | 136,2 | 19,5 | 118,7 | IV |
| Геалагічны | 184,9 | 39,8 | 484,2 | 24,7 | 44,1 | 14,3 | 135,4 | 19,7 | 98,2 | VI—VII |
| **КАФЕДРЫ ПРЫРОДАЗНАЎЧА-НАВУКОВАГА ПРОФІЛЮ** | | | | | | | | | | |
| Оптыкі | 51,9 | 17,5 | 222,4 | 5,3 | 17,2 | 16,1 | 219,8 | 45,2 | 84,1 | V—VI |
| МПК | 177,8 | 56,7 | 2516,1 | 60,2 | 13,8 | 12,9 | 62,0 | 12,7 | 142,5 | II |
| Галіновых эканомік | 70,4 | 22,4 | 1294,5 | 30,9 | 12,0 | 11,2 | 101,8 | 20,9 | 85,4 | V—VI |
| Агульнай фізікі | 104,9 | 33,4 | 622,1 | 14,9 | 18,7 | 17,4 | 61,6 | 12,7 | 78,4 | VII |
| Алгебры і геаметрыі | 19,8 | 6,3 | 744,1 | 17,8 | 11,2 | 10,5 | 149,7 | 30,8 | 65,4 | VIII |
| ВМ і П | 271,8 | 86,6 | 902,4 | 21,6 | 53,5 | 49,9 | 63,2 | 13,0 | 171,1 | I |
| Батанікі і фіз. раслін | 58,6 | 18,5 | 901,7 | 21,6 | 18,9 | 17,6 | 25,0 | 5,1 | 62,8 | IX |
| Заалогіі і аховы прыроды | 73,6 | 23,5 | 471,3 | 11,3 | 33,2 | 30,2 | 150,7 | 31,0 | 96,3 | IV |
| Гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі | 43,7 | 14,0 | 396,6 | 9,5 | 14,9 | 13,9 | 28,3 | 5,8 | 43,2 | XI |
| Фізікі цвёрдага цела | 22,3 | 7,1 | 3370,3 | 80,7 | 15,6 | 14,6 | 44,0 | 9,0 | 111,4 | III |
| ТСАЭІ | 44,0 | 14,0 | 1095,0 | 26,2 | 5,5 | 5,2 | 67,2 | 13,8 | 59,2 | X |
| **КАФЕДРЫ ГУМАНІТАРНАГА ПРОФІЛЮ** | | | | | | | | | | |
| Беларускай мовы | 23,2 | 10,3 | 731,7 | 67,3 | 27,0 | 25,3 | 85,2 | 41,4 | 144,3 | II—III |
| Педагогікі і псіхал. | 315,7 | 139,9 | 135,4 | 12,5 | 28,9 | 27,2 | 176,5 | 85,9 | 265,5 | I |
| Рускага, славянскага і агульнага мовазнаўства | 37,6 | 16,7 | 760,9 | 70,0 | 24,7 | 23,2 | 40,0 | 19,5 | 129,4 | IV |
| Беларускай літ. | 103,9 | 46,0 | 791,5 | 72,8 | 26,9 | 25,2 | 24,5 | 11,9 | 155,9 | II—III |
| Ням. і франц. моў | 34,1 | 15,1 | 185,1 | 17,0 | 35,8 | 33,5 | 34,8 | 17,0 | 82,6 | VI—VII |
| Англійскай мовы | 34,8 | 15,4 | 131,1 | 12,1 | 24,6 | 23,1 | 11,1 | 5,4 | 56,0 | VIII |
| Рускай літаратуры | 98,1 | 43,5 | 228,1 | 21,0 | 14,9 | 14,0 | 13,8 | 6,7 | 85,2 | V |
| Усеагульнай гісторыі | 25,6 | 13,1 | 314,7 | 28,9 | 30,4 | 28,5 | 25,0 | 12,2 | 82,5 | VI—VII |
| **КАФЕДРЫ ГРАМАДСКІХ НАУК** | | | | | | | | | | |
| Палітэканоміі | 148,93 | 92,2 | 418,03 | 71,8 | 83,1 | 40,5 | 130,5 | 109,2 | 313,7 | I |
| Філасофіі | 59,23 | 36,7 | 311,74 | 53,4 | 22,19 | 10,8 | 28,15 | 23,6 | 124,5 | IV |
| Этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму | 173,61 | 107,5 | 372,25 | 63,7 | 186,58 | 90,9 | 23,00 | 19,2 | 281,3 | II |
| Навуковага камунізму | 47,47 | 29,4 | 362,48 | 62,1 | 47,23 | 23,0 | 18,81 | 15,7 | 130,2 | III |
| Гісторыі СССР і БССР | 23,71 | 14,7 | 254,68 | 43,6 | 30,40 | 14,7 | 12,21 | 10,2 | 83,2 | V |
| Гісторыі КПСС | 31,54 | 19,5 | 32,81 | 5,6 | 41,54 | 20,1 | 26,37 | 22,1 | 67,3 | VI |
| **КАФЕДРЫ СПАРТЫЎНАГА ПРОФІЛЮ** | | | | | | | | | | |
| ТАФВ | 96,5 | 138,6 | 1115,8 | 131,5 | 43,0 | 24,5 | 38,1 | 51,0 | 345,6 | I |
| Фізвыхавання | 46,6 | 66,9 | 415,4 | 48,9 | 153,2 | 87,2 | 37,6 | 50,3 | 253,3 | II |
| Лёгкай атлетыкі | 31,6 | 45,4 | 783,5 | 92,3 | 19,1 | 10,8 | 4,6 | 6,2 | 154,7 | IV |
| ГА і МП | 34,2 | 49,1 | 232,4 | 27,3 | 136,1 | 77,5 | 69,3 | 92,5 | 246,4 | III |

# Клуб—клопаты камсамольскія

У Мінску 19 лютага адбыўся пленум ЦК ЛКСМ Беларусі. З дакладам аб дзейнасці камсамольскіх арганізацый рэспублікі па ўдасканаленню культурна-масавай і фізкультурна-аздараўленчай работы сярод моладзі ў святле патрабаванняў пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню выкарыстання клубных устаноў і спартыўных збудаванняў» выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ В. В. Гурын.

Для моладзі рэспублікі адкрыты дзверы амаль 6400 клубаў, Палацаў і Дамоў культуры, каля сямі тысяч масавых бібліятэк, 155 стадыёнаў, больш як 3500 спартыўных залаў і плавальных басейнаў, дзесяткі музеяў, тэатраў, паркаў і турысцкіх баз. Але сёння, адзначалася на пленуме, мала проста мець клуб або стадыён. Неабходны новыя, цікавыя формы культурна-масавай і аздараўленчай работы. Патрэбна стройная сістэма арганізацыі вольнага часу, прыцягнення юнакоў і дзяўчат да заняткаў фізкультурай, спортам і турызмам. Камітэты камсамола павінны лепш улічваць іх запатрабаванні і схільнасці, паўней выкарыстоўваць творчы патэнцыял маладых.

У прынятай пастанове намечаны шляхі якаснай перабудовы ўсёй сферы адпачынку моладзі.

На пленуме выступіў сакратар ЦК Кампартыі Беларусі А. Т. Кузьмін.

(БЕЛТА).

# СТАЛІ КАМУНІСТАМІ

**Група Ф-26 фізічнага факультэта сфарміравана з юнакоў, якія пасля першага курса былі прызваны на службу ў рады Савецкай Арміі і з гонарам выканалі свой пачэсны грамадзянскі абавязак, пасля чаго зноў працягваюць вучобу па абранай спецыяльнасці. Сярод іх — Анатоль Стрыжнёў, Мікалай Руеў, Сяргей Алейнікаў. Усе яны выдатна неслі воінскую службу, мелі шмат заахвочванняў, былі прыняты кандыдатамі ў члены КПСС. Напярэдадні XXVII з'езда КПСС і 68-ай гадавіны Узброеных Сіл СССР у жыцці Анатоля, Мікалая і Сяргея адбылася радасная падзея: іх прынялі ў члены КПСС.**

**Студэнт 4-га курса гэтага ж факультэта Міхаіл Жукевіч прыняты кандыдатам у члены КПСС.**

*Праблемы прыродаахоўнага руху*

# СТАНЬ ДРУЖЫННІКАМ, СТУДЭНТ!

У Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава адбылася міждружынная канферэнцыя «Метады, асновы і праблемы студэнцкага прыродаахоўнага руху». На працягу чатырох дзён прадстаўнікі дружын розных ВНУ краіны вялі дзелавую і прынцыповую размову аб праблемах дружыннага руху. У выступленнях удзельнікаў канферэнцыі адзначалася, што студэнцтва краіны не стаіць у баку ад прыродаахоўных задач, якія вырашаюцца ў краіне. Усё больш і больш юнакоў і дзяўчат пачынаюць разумець, што без іх дапамогі цяжка вырашаць грандыёзныя задачы па захаванню прыроды. Паказчыкам гэтага можа служыць колькасць дружын у краіне — 140. Аднак пакуль што іх якасны і колькасны састаў жадае быць лепшым. У асноўным, гэта дружыны біялагічных факультэтаў. Праўда, у апошні час яны сталі стварацца і ў тэхнічных ВНУ. І іх доля расце, што дазваляе дружыннаму руху пашыраць межы сваёй дзейнасці.

На канферэнцыі была сфармулявана новая функцыя дружыны на даным этапе. Дружыны па ахове прыроды павінны стаць не толькі органамі, якія караюць, але і прапагандысцкімі, навуковымі, **г. зн.** прапагандысцкая і навуковая работа павінна займаць у рабоце дружын такое ж месца як і выкараненне браканьерства. На канферэнцыі адзначалася, што колькасць браканьераў, якія не ведаюць прыродаахоўных законаў, пераважае над тымі, хто іх ведае. Таму роля прапагандысцкай работы ў цяперашні час надзвычай узрасла. А каб правільна весці яе, неабходна спачатку праводзіць навуковыя даследаванні з мэтай выяўлення прычын браканьерства. Толькі тады прапагандысцкая работа будзе эфектыўнай і прынясе сапраўдную карысць. Аб'яднаўшы правы дзяржаўных органаў, экалагічныя веды і энтузіязм моладзі, дружыны змогуць правільна падыходзіць да прыродаахоўных праблем, дабівацца станоўчых вынікаў. Але, як адзначалася на канферэнцыі, калі яны не выхаваюць экалагічна пісьменнае пакаленне, то ўсё тое, што яны робяць, будзе працягвацца вельмі доўга і не хутка дасць станоўчы вынік.

На даным этапе неабходна ствараць больш запаведнікаў, заказнікаў, выключыць з карыстання найбольш каштоўныя ўчасткі зямлі, а на тых, што выкарыстоўваюцца, неабходна весці правільнае навуковае землекарыстанне.

Удзельнікі канферэнцыі адзначылі, што сёння яшчэ не адпала неабходнасць удзелу студэнтаў у аператыўнай рабоце па недапушчэнню браканьерства. Бо сустракаюцца, на жаль, людзі, якія лічаць, што ўся акаляючая іх прырода належыць ім, і яны выкарыстоўваюць яе для асабістай нажывы. Вось чаму праводзяцца дружыннікамі аперацыі «Выстрал», «Нераст», «Елка», «Першацвет» і інш.

Члены Дружыны па ахове прыроды біяфака ГДУ выказваюць спадзяванне, што студэнты іншых факультэтаў універсітэта не застануцца ў баку ад маладзёжнага прыродаахоўнага руху. І тады, аб'яднаўшы нашы намаганні, мы зможам захаваць прыроду для цяперашняга і наступных пакаленняў.

**М. КУПРАЦЭВІЧ,**
**камандзір Дружыны па ахове прыроды ГДУ, студэнт 4-га курса біяфака, удзельнік канферэнцыі.**

*Цвярозасць — норма жыцця*

# СРОДКАМІ КІНО

На працягу двух гадоў у нас працуе факультэт кінамастацтва народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання. За гэты час прагледжаны лепшыя кінафільмы савецкага і зарубежнага кінематографа. Асаблівую ўвагу моладзь праяўляе да фільмаў героіка-патрыятычнай тэматыкі, таму што ў іх раскрываюцца сур'ёзныя праблемы і сённяшняга дня.

Улічваючы тое, што кіно з'яўляецца важным сродкам масавай інфармацыі і прапаганды, мы выкарыстоўваем гэтую «трыбуну» і ў мэтах антыалкагольнай прапаганды, выхавання людзей у духу цвярозасці, нецярпімых адносін да п'янства і алкагалізму, якія наносяць вялікую шкоду здароўю, адмоўна адбіваюцца на ўсіх баках грамадскага жыцця.

На факультэце кінамастацтва створаны кіналекторый «Цвярозасць — норма жыцця». Некалькі фільмаў гэтага напрамку ўжо прагледжаны студэнтамі факультэта фізічнага выхавання і эканомфака.

У другім семестры бягучага навучальнага года таксама прадугледжана дэманстрацыя фільмаў на антыалкагольную тэматыку. Сярод іх — «Зло сям'і і грамадства», «П'юць бацькі — пакутуюць дзеці», «Алкаголь і падлетак», «Добрыя традыцыі і шкодныя звычкі», «Барацьба з п'янствам — справа кожнага» і інш.

У рабоце кіналекторыя прымуць удзел работнікі аховы здароўя і праваахоўных органаў.

**І. ХАДАЛЕВІЧ,**
**дэкан факультэта кінамастацтва.**

*Юрыдычная кансультацыя*

# ПАЎНАМОЦТВЫ ПРАЦОЎНАГА КАЛЕКТЫВУ

Трэці год дзейнічае Закон СССР аб працоўных калектывах. За гэты час з'явіліся новыя нарматыўныя акты, якія дапаўняюць заканадаўства аб удзеле працоўнага калектыву ў вырашэнні розных вытворчых і сацыяльна-эканамічных пытанняў.

У адпаведнасці з заканадаўствам працоўныя калектывы выбіраюць кандыдатаў у дэпутаты Саветаў народных дэпутатаў, прадстаўнікоў у састаў выбарчых камісій, выбіраюць народных засядацеляў раённых народных судоў, групы народнага кантролю, таварыскія суды і іншыя грамадскія органы. Працоўныя калектывы актыўна ўдзельнічаюць у распрацоўцы планаў, маюць права заслухоўваць адміністрацыю аб ходзе выканання планаў і дагаворных абавязацельстваў, аб выніках вытворча-гаспадарчай дзейнасці, кантралююць рэалізацыю сродкаў эканамічнага стымулявання.

Вялікая ўвага ў Законе ўдзелена ўмацаванню працоўнай дысцыпліны. Цяпер Правілы ўнутранага распарадку зацвярджаюцца не адміністрацыяй і прафсаюзным камітэтам, а па іх прадстаўленню — працоўным калектывам, які прымае меры па іх безумоўнаму выкананню. Працоўныя калектывы ўстанаўліваюць дадатковыя льготы і перавагі для перадавікоў вытворчасці, а таксама для тых, хто добрасумленна працуе ў калектыве на працягу многіх гадоў, вылучаюць кандыдатуры работнікаў для маральнага і матэрыяльнага заахвочвання.

За парушэнне дысцыпліны працоўныя калектывы згодна арт. 9 Закона прымяняюць меры грамадскага ўздзеяння (таварыская заўвага, грамадская вымова), перадаюць матэрыялы аб парушальніках працоўнай дысцыпліны на разгляд таварыскага суда. У неабходных выпадках працоўны калектыў можа паставіць пытанне аб прыцягненні парушальніка працоўнай дысцыпліны да адказнасці: часова перавесці яго на ніжэй аплачваемую работу, зволіць з работы, пазбавіць яго часткова або поўнасцю прэміі і г. д.

Працоўны калектыў можа датэрмінова здымаць накладзенае ім спагнанне, а таксама хадайнічаць перад адміністрацыяй аб зняцці дысцыплінарнага спагнання, калі член калектыву не дапускае новых парушэнняў і праявіў сябе як добрасумленны работнік.

Законам вызначаны паўнамоцтвы працоўнага калектыву ў арганізацыі работы па выхаванню работнікаў у духу савецкага патрыятызму, дружбы і братэрства народаў, захавання правілаў сацыялістычнага агульнажыцця, ашчадных адносін да народнага дабра, непрымірымасці да п'янства, хуліганства.

Найбольш важныя пытанні жыцця і дзейнасці прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый разглядаюцца агульнымі сходамі (канферэнцыямі) працоўных калектываў, якія праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей двух разоў у год. Сходы працоўных калектываў могуць праводзіцца па аддзелах, структурных падраздзяленнях і лічацца правамоцнымі, калі ў іх прымае ўдзел больш палавіны агульнай колькасці членаў калектыву. Рашэнні прымаюцца агульным галасаваннем па большасці галасоў.

Прапановы і рэкамендацыі працоўных калектываў разглядаюцца ў месячны тэрмін адміністрацыяй, прафсаюзнай і іншымі грамадскімі арганізацыямі, а ў выпадку неабходнасці таксама і адпаведнымі дзяржаўнымі і грамадскімі органамі. Аб выніках разгляду прапаноў і рэкамендацый адміністрацыя, названыя арганізацыі і органы паведамляюць працоўнаму калектыву.

**В. РУПІН,**
**юрысконсульт ГДУ.**

## НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

### ЛІТАРАТУРА ДА XXVII З'ЕЗДА КПСС

У кнігарні № 19 па вул. Савецкая, 106 ёсць у продажу літаратура да XXVII з'езда КПСС.

**У. І. Ленін, КПСС аб сацыялістычным спаборніцтве.** — М., Палітвыдат, 1982 г. У тэматычны зборнік увайшлі поўнасцю або часткова творы У. І. Леніна, дакументы Камуністычнай партыі аб сацыялістычным спаборніцтве.

**У. І. Ленін, КПСС аб сацыялістычнай законнасці і правапарадку.** — М., Палітвыдат, 1982.

У кнізе змешчаны артыкулы, даклады, прамовы, пісьмы У. І. Леніна, дакументы і матэрыялы з'ездаў, якія вызначаюць ролю законнасці і правапарадку на ўсіх этапах камуністычнага будаўніцтва, задачы партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый ва ўмацаванні законнасці і правапарадку.

ХУСАІНАЎ Ю. М. **На шляху да вялікага хлеба.** — Мн., Беларусь, 1985.

У кнізе абагулен вялікі вопыт развіцця сельскай гаспадаркі і перапрацоўваючай прамысловасці, прынцыпы станаўлення і функцыяніравання аграпрамысловых аб'яднанняў, іх перавагі і вынікі дзейнасці.

ПЯТРОЎ Н. І. **Адзін за ўсіх — усе за аднаго. Калектывізм як рыса сацыялістычнага ладу жыцця.** — М., Мысль, 1985.

БАНДАРЭНКА Н. А. **Давер'е камуністаў.** — Мн., Беларусь, 1985.

## СПОРТ

### ЧЭМПІЁНЫ!

**У г. Гродна завяршыліся спаборніцтвы па баскетболу па праграме IX летняй спартакіяды БССР. Зборная каманда Гомельшчыны (трэнер — старшы выкладчык факультэта фізвыхавання Б. А. Царыкаў) была сфарміравана на базе нашага універсітэта. Яна выступіла з вялікім поспехам: заваявала званне чэмпіёна.**

На першым этапе гульні праходзілі ў групах. Нашы баскетбалісты нанеслі паражэнні калектывам Магілёўскай, Віцебскай і Брэсцкай абласцей і з заліковым ачком выйшлі ў фінал. Тут яны дабіліся перамог над камандамі Мінскай і Гродзенскай абласцей і заваявалі вышэйшую ўзнагароду. Асабліва напружаным быў матч з камандай Гродзеншчыны. Нашы спартсмены здолелі выйграць яго з перавагай у адно ачко.

У пераможцаў высокі клас гульні прадэманстраваў студэнт 4-га курса факультэта фізвыхавання майстар спорту СССР Аляксандр Жэдзь, якому быў прысуджаны спецыяльны прыз. Здольным баскетбалістам зарэкамендаваў сябе і першакурснік фізічнага факультэта Сяргей Пінчук.

**В. СЕЛІВАНАЎ,**
**начальнік каманды.**

### НА ФІНІШЫ ТЫДНЯ ЛЫЖНІКАЎ

З 10-га лютага ў нашай краіне праводзіўся Усесаюзны тыдзень лыжніка. Актыўны ўдзел прынялі ў ім студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі нашага універсітэта. Асабліва масавай на спаборніцтвы была мінулая нядзеля. Лыжнікі Цэнтральнага раёна нашага горада выйшлі на трасы здароўя ў зарэчнай зоне. Сярод спаборнічаючых было каля 100 прадстаўнікоў ГДУ. Мужчыны і юнакі пamepаліся сіламі на пяцікіламетровай, жанчыны і дзяўчаты — на трохкіламетровай дыстанцыях.

Сярод студэнтаў лепшы вынік паказаў другакурснік факультэта фізвыхавання Л. Цейкін. Студэнтка 4-га курса біяфака В. Скачкова была мацнейшай па групе дзяўчат. Ім уручаны граматы спартклуба ГДУ і памятныя падарункі спартклуба і раённага спарткамітэта.

Па групе мужчын першым закончыў дыстанцыю выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту М. Каняхін, сярод жанчын — выкладчыца кафедры фізвыхавання Л. Марозава.

Мінулая нядзеля стала сапраўдным святам лыжнага спорту, прынесла вялікае задавальненне ўсім удзельнікам.

**В. СІСЬКОЎ,**
**старшыня спартклуба ГДУ.**

### ПА ПРАГРАМЕ СПАРТАКІЯДЫ «ЗДАРОЎЕ»

Заканчваецца універсітэцкая спартакіяда «Здароўе-86». У спаборніцтвах па шасці відах спорту прынялі ўдзел 189 выкладчыкаў і супрацоўнікаў з усіх факультэтаў.

У спаборніцтвах па шахматах і кулявой стральбе першыя месцы заваявалі каманды фізічнага факультэта (капітаны А. Падалаў, В. Торап).

У спаборніцтвах па плаванню, міні-футболу, настольнаму тэнісу мацнейшымі аказаліся каманды матэматычнага факультэта (капітаны В. Мярэжа, М. Селькін, П. Эдзігер).

На валейбольнай пляцоўцы вызначылася каманда геалагічнага факультэта (капітан Г. Варатніцкі).

У асабістым заліку сярод стралкоў перамог А. Парукаў з гістфіла. Другі вынік паказаў В. Торап з фізічнага і трэці — Н. Дрынеўская з матфака.

Сярод плыўцоў прызавыя месцы занялі адпаведна: па старшай узроставай групе жанчын — Ж. А. Герасімава з геалагічнага і А. В. Саннікава з матэматычнага факультэтаў; малодшай узроставай групе — Е. Закалодная з факультэта фізвыхавання, Е. Мяняйлава і Н. Торап з матэматычнага факультэта.

У старэйшай узроставай групе сярод мужчын перамог Г. І. Варатніцкі з геалагічнага факультэта, прызёры — Г. А. Сербін з гэтага ж факультэта і П. Д. Грыгарук з матфака; па малодшай узроставай групе — А. Сідараў, А. Кармазін з матфака і В. Залатарэнка з фізічнага факультэта.

Пасля шасці відаў праграмы лепшую суму ачкоў набраў матэматычны факультэт. Другі радок у турнірнай табліцы займае геафак, трэці — гістфіл, чацвёрты — біяфак, пятае-сёмае месцы дзеляць факультэты фізвыхавання, фізічны і эканамічны.

Прафсаюзным бюро факультэтаў, асабліва фізічнага, эканамічнага і факультэта фізвыхавання, неабходна ўзмацніць арганізацыйную работу па далучэнню да заняткаў у групах «Здароўе» большай колькасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

**А. ГРЫШАЧКІН,**
**галоўны суддзя спартакіяды «Здароўе».**

### СКРЫЖАВАЛІ КЛІНКІ ШПАЖЫСТЫ

На спартакіядзе спартклубаў ВНУ рэспублікі, якая праходзіла ў Мінску, нашы шпажысты ў камандным заліку занялі трэцяе прызавое месца. Найбольш вызначыўся студэнт факультэта фізвыхавання майстар спорту СССР Віталь Хімакоў. У фехтаванні на шаблях ён быў пятым.

Паспяхова выступілі нашы спартсмены ў камандных спаборніцтвах. У прыватнасці, шаблісты і рапірысткі выйшлі на другое месца, рапірысты былі трэцімі, шпажысты — пятымі. Каманда ГДУ набрала 233 ачкі і размясцілася ў турнірнай табліцы ўслед за дружынамі Беларускага інстытута фізічнай культуры і БПІ, апярэдзіўшы моцныя калектывы БДУ імя У. І. Леніна, МРТІ і Брэсцкага педагагічнага інстытута.

**В. ЛІСОЎСКІ,**
**трэнер каманды.**



БУДУЧЫЯ ЧЭМПІЁНКІ.

Фота У. Чысціка.

## ВАШ АДПАЧЫНАК

**СЁННЯ**

**Да 68-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту:**

Актавая зала, 19.30 — вечар гісторыка-філалагічнага і біялагічнага факультэтаў.

Інтэрнат № 2. 19.00 — маладзёжны вечар «Пасвячэнне ў рыцары».

14 — 15.30 — масавыя спаборніцтвы па вольнай барацьбе; 16 — 18.30 — гульні па валейболу, баскетболу; 18.45—21 — работа секцыі па ручному мячу (падшэфныя ДСШ), спаборніцтвы па настольнаму тэнісу па месцу жыхарства.

**ЗАЎТРА**

10 — 14 — масавыя спаборніцтвы па валейболу, баскетболу, кулявой стральбе па праграме дзён гісторыка-філалагічнага факультэта; 14—16 — заняткі сямейнага спартыўнага клуба; 16—19 — гульні па валейболу групы «Здароўе»; 19—21 — работа секцыі па ручному мячу (падшэфныя домакіраўніцтвы).

**НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ**

28-га лютага ў інтэрнаце № 2 адбудзецца пасяджэнне клуба народнай песні «Спяёмце, сябры». Пачатак — 20.00.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

А 323163

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 145.